# *Уступ*

Пасля польска-савецкай вайны і заключэння Рыжскага дагавору ў сакавіку 1921 года, тэрыторыя, на якой пражывалі беларусы, апынулася ў дзвюх дзяржавах — Польшчы і Савецкім Саюзе. Беларусы, грамадзяне Польшчы, складалі звыш двухмільённую нацыянальную групу[1], культурнай адметнасці якой не хацелі бачыць дзяржаўныя ўлады, паслядоўна рэалізуючыя палітыку асіміляцыі славянскіх меншасцей. Большасць беларусаў пражывала ў чатырох паўночна-ўсходніх ваяводствах: Палескім — 654 тыс., Наваградскім — 616 тыс., Віленскім — 407 тыс. і Беластоцкім — 269 тыс.[2]

У адпаведнасці з міжнароднымі пагадненнямі, якія падпісала Польшча, беларусы павінны былі атрымаць усе правы і свабоды, належныя нацыянальным меншасцям[3]. Грамадзянскія правы гарантавала ім таксама прынятая Сеймам Польшчы ў сакавіку 1921 г. канстытуцыя. Пісалася ў ёй, што ўсе грамадзяне краіны маюць права на захаванне свае нацыянальнай тоеснасці, публічнае карыстанне роднай мовай, ніхто не павінен быць дыскрымінаваны па прычыне культурнай ці рэлігійнай адметнасці (артыкулы 108-112).

На практыцы выглядала гэта зусім інакш па прычыне палітычнай стратэгіі польскіх партый і асяродкаў улады ды эканамічнай адсталасці паўночна-ўсходніх ваяводстваў, спрыяючай пастаянным сацыяльным і палітычным канфліктам. Большасць на гэтай тэрыторыі беларускага насельніцтва адчувала сябе ўсебакова дыскрымінаваным, таму канфлікт з дзяржаўнымі ўладамі быў проста непазбежны.

У Польшчы на пачатку дваццатых гадоў перамагла канцэпцыя пабудовы дзяржавы паводле праграмы нацыянал-дэмакратаў. Прадбачыла яна поўную асіміляцыю беларусаў і ўкраінцаў, а ў

недалёкай будучыні стварэнне з гэтых славянскіх меншасцей патрыятычна думаючых палякаў[4]. Польскія эліты не прадбачылі толькі таго, што гвалтам накінутая асіміляцыйная палітыка выкліча зусім адваротныя рэакцыі, а таксама таго, што эканамічная сітуацыя беларускага насельніцтва не будзе спрыяць нават развіццю пачуцця тоеснасці з польскай дзяржавай. Пры такім палітычным стане вельмі лёгка спрацаваў аргумент альтэрнатывы ў выглядзе беларускай савецкай дзяржаўнасці. Найбольшыя арганізацыі — Камуністычная партыя Заходняй Беларусі і Беларуская сялянска-работніцкая грамада — вялі сваю дзейнасць пад лозунгамі яднання беларускіх зямель у сацыялістычнай дзяржаве. Прасавецкая арыентацыя гэтых партый была надта выразнай.

Беларусы адрозніваліся ад палякаў мовай, культурай, найчасцей таксама веравызнаннем, але перш за ўсё месцам у грамадскай і палітычнай іерархіі. Пераважную большасць беларускага насельніцтва складалі сяляне. Сярод жыхароў гарадоў беларусы мелі нязначную групу. У гарадах дамінавалі яўрэі і палякі.

Па прычыне фальсіфікацыі дзяржаўнай адміністрацыяй вынікаў перапісаў насельніцтва большасць даследчыкаў для вызначэння нацыянальнай структуры гарадоў, мястэчак і вёсак у паўночна-ўсходняй Польшчы прымяняла крытэрый веравызнання[5]. Хаця гэта не надта дасканалы спосаб вырашання нацыянальных пытанняў у навуцы, аднак, напрыклад, у выпадку Беласточчыны цалкам апраўданы. Паводле перапісу ад 1931 года 91 працэнт праваслаўных жыхароў Беластоцкага ваяводства пражывала на вёсцы. Адсотак гэты быў яшчэ вышэйшы ў Віленскім — 93 прац., Палескім — 95 прац. і Наваградскім ваяводствах — 96,5 прац.[6]

Больш за 90 прац. беларускага насельніцтва сродкі на пражыванне атрымлівала з сельскагаспадарчай дзейнасці. Амаль 7 прац. складалі людзі, якіх умоўна можна было б назваць рабочым класам. Большасць рабочых складалі парабкі, лесарубы і служанкі. Троху лепш было ў Беластоцкім ваяводстве, дзе рабочыя беларусы складалі звыш 13 прац. (18 тысяч) людзей гэтай нацыянальнасці, з гэтага ліку амаль 6 тысяч працавала ў прамысловасці[7].

Беларускія рабочыя выконвалі працу, якая не патрабавала адукацыі, ні прафесійнай падрыхтоўкі і менш аплачвалася. Беларусаў

не было сярод супрацоўнікаў тэхнічнага нагляду. Не прымалі іх таксама на працу ў прадпрыемствах дзяржаўнага сектара — у транспарце, сувязі, дапаможных службах. Улады не давяралі беларусам і баяліся з іх боку сабатажнай дзейнасці[8].

Прамысловасць ва ўсходняй Беласточчыне ўяўляла сабой млыны, тартакі, спіртзаводы, цагельні, малачарні, дзе на працу найчасцей прымалі толькі па некалькі чалавек. Сацыяльнае заканадаўства ў такіх установах не прымянялася, а ўмовы працы і плата былі вынікам адвольнага рашэння ўласніка завода. Найбольш характэрны тып беларускага работніка гэта парабак, які працаваў у фальварку разам з сям'ёй[9]. Жонка даіла кароў, дзеці пасвілі свіней або выконвалі іншую работу ў полі. Уласнік фальварка ўзамен за працу даваў кватэру, кавалак зямлі пад агародніну і бульбу ды плату ў выглядзе малака, качкі ці гускі. Падабенства да капіталістычных адносін было ў гэтым выпадку вельмі малое. Рабочыя ў фальварках былі цалкам залежныя ад работадаўцы і выконвалі кожную працу ўзамен за сродкі для біялагічнага існавання.

Шмат працы ў фальварках выконвалі сяляне, якія наймаліся на пэўны тэрмін. Зараблялі такім спосабам на падаткі або адраблялі пазычаную ва ўласніка фальварка муку, бульбу, грошы.

Рамеснікі беларускага паходжання пражывалі найчасцей у мястэчках. Вялікая канкурэнцыя з боку яўрэйскіх і польскіх саматужнікаў, а таксама агульная беднасць грамадства не дазвалялі гэтай грамадскай групе развівацца, накопліваць капітал і пашыраць дзейнасць. Прыбытак ад рамесніцкай працы найчасцей дазваляў саматужніку толькі на пражыванне ягонай сям'і[10]. У Беластоцкім і Палескім ваяводствах праслойка беларускага купецтва амаль адсутнічала. Гандаль у мястэчках цалкам належаў яўрэям.

У кожнай вёсцы ва ўсходняй Беласточчыне існавала група сялян, якая апрача традыцыйнай працы на гаспадарцы выконвала розныя паслугі рамесніцкага характару. Былі гэта сталяры, кавалі, краўцы, пячнікі. Вясковыя спецыялісты выконвалі амаль усё, што было патрэбнае ў гаспадарцы ці ў хаце. Рабілі яны гліняныя гаршкі розных памераў, валёнкі з авечай воўны, граблі і вілы з дрэва, цэглу і чарапіцу з гліны, выціскалі канапляны і льняны алей. За працу і вырабы вясковых рамеснікаў не заўсёды плацілі грашыма. Часам

пералічвалі такую працу на вартасць збожжа, хатняй жывёлы, саматканага палатна. Калі ў рамесніка была большая гаспадарка, даўжнік мог адпрацаваць належную за паслугу суму на ягоным полі. Не толькі на Беласточчыне, але таксама на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі выступала шмат элементаў натуральнай гаспадаркі, дзе абмен адбываўся без пасрэдніцтва грошай. У кожным мястэчку раз у тыдзень адбываліся кірмашы, на якіх вясковыя рамеснікі прадавалі свае вырабы. Можна там было набыць усё, што ў найбліжэйшай ваколіцы выраблялася з дрэва, саломы і гліны.

Больш за 40 прац. зямлі ў Заходняй Беларусі займалі аблогі, лясы, пашы, балоты. Урадлівая глеба была тут рэдкасцю. Напрыклад, у міжваенны перыяд ва ўсходніх гмінах Бельскага павета Беластоцкага ваяводства зямля I і II класаў адсутнічала, 40 прац. займала зямля IV-VI класаў, а 55 прац. займалі аблогі, лясы, балоты і пашы[11]. У фальварках адсотак аблогаў быў яшчэ вышэйшы. Таму агульная ўраджайнасць з аднаго гектара была тут у параўнанні да цэнтральных ваяводстваў Польшчы вельмі нізкая. Каб адмяніць існуючы стан, патрэбны былі вялікія інвестыцыі, якія патрабавалі значных капіталаўкладанняў. Грошай сяляне не мелі, а дзяржаўныя ўлады нават у далёкай перспектыве не планавалі на гэтай тэрыторыі ніякіх інвестыцый.

Эканамічныя вынікі гаспадарання вёскі ва ўсходняй Беласточчыне рашуча ўплывалі на ўмовы штодзённага жыцця яе жыхароў. Сяляне мала куплялі і мала прадавалі. Большасць прылад, неабходных дома і ў гаспадарцы, рабілі саматужным спосабам. Хатняга вырабу былі вопратка, абутак і шмат іншых гаспадарчых ды хатніх прылад. Льняное палатно ткалі ў кожнай хаце. У якасці летняга абутку служылі лапці з лыка. Асноўнымі харчовымі прадуктамі былі капуста, бульба, хлеб, печаны са змеленай мукі ў сваіх жорнах, і рыба, якую лавілі ў рэчках, сажалках і іншых вадаёмах. Мяса на стале з’яўлялася вельмі рэдка, найчасцей у час вялікіх царкоўных святаў — Вялікадня, Каляд, з нагоды вянчання ці хрысцінаў.

Нават уласнікам дзесяцігектарных гаспадарак складана было пракарміць сям’ю. Невялікая рэнтабельнасць гаспадарак, шматдзетнасць і адсутнасць працы ў мястэчках і гарадах замарожвалі

стан эканамічнай безнадзейнасці. Голад пастаянна спадарожнічаў сярод вялікай часткі вясковага насельніцтва. Некаторыя сяляне фінансавыя аперацыі абмяжоўвалі да пакупкі запалак, солі і газы для лямпы[12].

Рэліктам феадалізму на Беласточчыне былі зямельныя сервітуты — уласнасць усіх жыхароў вёскі. У Беластоцкім ваяводстве займалі яны каля 20 працэнтаў усяе зямлі. Найчасцей былі гэта пашы і лясы. Найбяднейшым сервітуты дазвалялі пракарміць 1-2 каровы, таму іх ліквідацыя, якая праводзілася ў дваццатыя гады падчас рэфармавання структуры ўласнасці, пагоршвала сітуацыю малазямельных і тых, хто зямлі не меў. Падзелы сервітутаў давалі карысць багацейшым гаспадарам, якія не былі залежныя ад супольнай уласнасці[13]. Ліквідацыяй сервітутаў асабліва зацікаўленыя былі ўласнікі фальваркаў, якія фармальна таксама маглі імі карыстацца. Аднак фальварчнае быдла ці свіней рэдка пасвілі разам з сялянскімі. Падзел сервітутнай зямлі адбываўся прапарцыянальна да існуючай структуры ўласнасці. Багацейшыя атрымлівалі найбольш, беззямельныя — амаль нічога.

Беларуская інтэлігенцыя як грамадская група ў міжваеннай Польшчы была нешматлікай. Гэта былі ў асноўным настаўнікі і чыноўнікі ніжэйшага рангу былой царскай адміністрацыі. У выніку паланізацыйнай палітыкі ўлад яны найчасцей заставаліся без працы, некаторыя шукалі занятку ў дробным гандлі, рамесніцтве, і нават апускаліся да жабрачага стану[14]. Шмат хто з інтэлігентаў пайшоў у палітыку, найчасцей імкнучыся да ліквідацыі сістэмы, якая прывяла іх да прыніжанага становішча. Уздзеянне інтэлігенцыі на сялянскае асяроддзе, па прычыне адсутнасці беларускага школьніцтва, было невялікім. Пэўнае грамадскае значэнне мела беларуская інтэлігенцыя на Віленшчыне, дзе існавала шмат арганізацый, выдавалася прэса, а ў Віленскай гімназіі, ліцэі, на факультэце беларускай філалогіі мясцовага універсітэта вучылася пару соцень маладых беларусаў. На Віленшчыне дзейнічаў Беларускі банк і Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры. Пры гэтых установах працавала пару дзесяткаў дзеячаў. На Беласточчыне не было ні беларускіх школ, ні рэдакцый, ні ўстаноў гаспадарчага характару. Таму маладым беларусам, шукаючым шанцаў у адукацыі, дарога вяла ў польскую школу. Такім

чынам у міжваенны перыяд вырастала пакаленне інтэлігенцыі беларускага паходжання, але польскай нацыянальнай арыентацыі.

Беларускае культурнае жыццё на Беласточчыне развівалі мясцовыя актывісты-самавукі і перасяленцы з Віленшчыны[15]. У Беластоку рабіліся захады стварыць аддзяленне Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, гаспадарчага кааператыва, але мясцовыя ўлады не далі на такую дзейнасць дазволу. Ініцыятарам гэтага руху быў каталіцкі святар Язэп Рэшаць. Нарадзіўся ён у Рушчанах каля Харошчы і пасля вяртання з Вільні на Беласточчыну спрабаваў раскруціць тут беларускае нацыянальнае жыццё. Яго актыўнасць знарок тармазілі як касцельныя, так і дзяржаўныя ўлады[16].

З Беласточчыны выйшлі таксама іншыя знакамітыя дзеячы беларускага нацыянальнага і культурнага руху, такія як Уладзіслаў Казлоўскі — палітык і публіцыст, і Ян Тарасевіч — кампазітар. Аднак іх актыўнасць пераважна праяўлялася на Віленшчыне.

У 1927 г. у Беластоку ўзнік аддзел Таварыства беларускай школы, які арганізаваў свой тэатр, хор і бібліятэку. Хаця ўлады знаходзілі шмат фармальных прычын, каб паралізаваць актыўнасць беластоцкіх дзеячаў, здолелі яны сем гадоў працаваць сярод гарадскога і вясковага насельніцтва, зацікавіць беларускай культурнай спадчынай тысячы людзей. Усё гэта адбывалася дзякуючы такім асобам, як Аляксандр Андрайчук, Лявон Богуш, Антон Кавальчук, Кастусь Сідаровіч, Васіль Лукашук, Пётр Дзямідовіч, Уладзімір Маеўскі, Анна Абуховіч і Сяргей Крывец[17].

Беларускі памешчыцкі стан у міжваеннай Польшчы амаль не існаваў. Больш за 84 прац. фальваракаў было ўласнасцю палякаў. Памешчыкі беларусы ў Заходняй Беларусі складалі толькі 4 прац. вялікіх землеўласнікаў. На Беласточчыне сярод уладальнікаў гаспадарак, якія налічвалі больш за 50 гектараў, беларусы складалі толькі 2,5 працэнта ўласнікаў[18]. Фальваркі былі тут значна меншыя, чым, напрыклад, у Палескім ваяводстве. Ва ўладанні памешчыкаў у Беластоцкім ваяводстве было 18 працэнтаў зямлі, у Палескім — палова. Сярэдняя плошча фальварка на Беласточчыне складала 460 гектараў, на Палессі — 2 100.

Беларускія паслы ў Сейме Польшчы не раз сітуацыю на тэрыторыі Заходняй Беларусі характарызавалі як каланіяльную[19].

Мясцовая адміністрацыя ўспрымала беларусаў як людзей горшай катэгорыі, запозненых у цывілізацыйным развіцці, пазбаўленых нацыянальнай культуры, сярод якіх працэс паланізацыі павінен прайсці беспраблемна. Улады Польшчы цалкам праігнаравалі факт, што беларусы ў канцы першай сусветнай вайны рабілі спробы стварэння свае дзяржавы, і, што ў гэты працэс падключаны былі дзесяткі тысяч людзей. За ўсходняй мяжой існавала таксама савецкая беларуская дзяржаўнасць, якая ў дваццатыя гады стала фактычна краінай развіцця нацыянальнай культуры. Беларусы ў Польшчы не былі, як здавалася ўладам, людской масай, пазбаўленай якой-небудзь нацыянальнай свядомасці. Таму супярэчнасць інтарэсаў дзяржаўных улад і грамадзян II Рэчы Паспалітай беларускай нацыянальнасці была вельмі выразнай.

Польская дзяржава бачылася беларусам цалкам чужой. З другога боку беларусы найчасцей успрымаліся дзяржаўнымі органамі як нелаяльныя грамадзяне, якіх да шанавання дзеючага заканадаўства трэба прымушаць паліцыйнымі метадамі. Такое разыходжанне паміж беларускім насельніцтвам і польскай уладай выявілася ўжо падчас вайны 1920 г.[20] На пачатку дваццатых гадоў паралельна да станаўлення структур польскай улады ліквідавалася беларускае школьніцтва, некаторыя цэрквы ператвараліся ў касцёлы, а нацыянальныя дзеячы апынуліся ў зняволенні. Ва ўмовах парламентарнай дэмакратыі (1921-1926) не ўзнікла ніякая праграма палітыкі ў адносінах да беларусаў. Усе справы найчасцей вырашала лакальная адміністрацыя, якая моцна дыскрымінавала беларусаў.

На пачатку дваццатых гадоў на Беласточчыне ўзнікла даволі буйная беларуская канспірацыя. Хаця інспіравалася яна палітычнымі цэнтрамі ў Літве і Савецкай Беларусі, аднак масавасць руху паказвала, што прычыны бунту былі вельмі глыбокія. Партызанскі атрад „Скамароха”, які дзейнічаў у ваколіцы Белавежскай пушчы пад камандаваннем Германа Шыманюка, выдаваў нават свой часопіс „Беларускі партызан”. На яго старонках канспіратары тлумачылі неабходнасць барацьбы з польскай уладай. Палітычнае камандаванне ніколі не заклікала да ўзброеных груп, таму паасобныя камандзіры вялі найчасцей свае малыя войны супраць мясцовай паліцыі, адміністрацыі, асаднікаў. Да 1924 года большасць гэтых малых

атрадаў была ліквідавана дзяржаўнымі паліцыйнымі і вайсковымі фарміраваннямі. Арыштаваных партызан суды найчасцей прыгаворвалі да найвышэйшай меры пакарання[21].

На пачатку 1923 г. арыштавана было палітычнае кіраўніцтва партызанскага руху на Беласточчыне. У траўні гэтага ж года ў беластоцкім судзе пачаўся працэс 45-ці канспіратараў. Абвінавачаных было сем настаўнікаў, некалькі былых афіцэраў царскай арміі, двое паслоў польскага Сейма, інжынер, фельчар, некалькіх купцоў і работнікаў, але найбольш — ажно 22 — сялян[22]. Дзевяць абвінавачаных заявілі перад судом, што іх удзел у канспірацыі быў вынікам волі змагання за незалежную беларускую дзяржаўнасць, астатнія гаварылі пра крыўды, нанесеныя ім органамі дзяржаўнай улады — катаванні ў турмах, праследаванні высокімі падаткамі людзей паміраючых ад голаду, ці зняволенні па прычыне арганізавання культурнай беларускай дзейнасці. Галоўная абвінавачаная, настаўніца Вера Маслоўская, сказала, што рабіла тое, што з'яўляецца абавязкам кожнага патрыёта, калі яго Бацькаўшчына знаходзіцца ў няволі. Заявіла, што беларуская зямля акупуецца не толькі палякамі, але таксама рускімі і латышамі, і што беларускі вызвольны рух, у якім яна ўдзельнічала, накіраваны быў супраць усіх акупацыйных рэжымаў[23].

Найважнейшым патрабаваннем беларускай эліты ў міжваенны перыяд было стварэнне адукацыйнай сістэмы на роднай мове. Беларускае школьніцтва, якое існавала падчас нямецкай акупацыі, было ліквідавана ўладамі яшчэ на пачатку дваццатых гадоў. У 1925 г. двухмільённая нацыянальная меншасць мела толькі тры школы з беларускай мовай навучання, у якіх вучылася 425 дзяцей. Існавалі таксама 19 двухмоўных школ з 1 683 вучнямі. Усіх беларускамоўных дзяцей у Польшчы ў школьным узросце было больш за 150 тысяч. Наглядалася выразнае разыходжанне паміж тым, што дэкларавала дзяржава ў канстытуцыі і іншых заканадаўчых актах і практыкай штодзённага жыцця. У ліпені 1924 г. Сейм прыняў закон аб школьніцтве для нацыянальных меншасцей ва ўсходніх ваяводствах[24]. Закон гэты стварыў фармальныя падставы для арганізавання беларускага школьніцтва ў паўночна-ўсходніх ваяводствах, за выключэннем Бельскага, Беластоцкага і Сакольскага

паветаў. Парламентарыі прыйшлі да высновы, што ўсходняя Беласточчына павінна ўспрымацца як чыста этнічная польская тэрыторыя. Не абазначае гэта, што нейкія новыя беларускія школы ўзніклі ў іншых ваяводствах. Пастановай міністэрства адукацi было ўведзена шмат розных абмежаванняў, якія дазвалялі павятовай школьнай адміністрацыі прымаць адвольныя рашэнні ў справе школ з беларускай мовай навучання[25].

Сітуацыя трошку памянялася пасля перавароту Язэпа Пілсудскага ў траўні 1926 г. Шмат палітыкаў санацыйнага лагера прытрымлівалася ідэі дзяржаўнай асіміляцыі, як больш надзейнай чым нацыянальная. На практыцы мела гэта выглядаць так, што нацыянальныя меншасці атрымаюць шырокія магчымасці развіцця сваей культуры і асветы, што ў выніку павінна прывесці іх да лаяльнасці і пашаны дзяржаўных устаноў. У 1927-1929 гадах узніклі 4 сярэднія школы з беларускай мовай навучання, а да 49 узрасла колькасць двухмоўных пачатковых школ[26]. Перыяд ліберальнай палітыкі закончыўся на пачатку трыццатых гадоў, калі нанава пачалі закрываць нядаўна ўзнікнуўшыя школы. Паралельна ліквідаваліся структуры Таварыства беларускай школы, а дзеячы гэтай грамадскай арганізацыі абвінавачваліся ў схільнасці да камунізму. Апошнім у 1935 г. быў ліквідаваны беластоцкі аддзел ТБШ.

Беларускі палітычны рух у міжваеннай Польшчы быў моцна дыферэнцыраваны, а адзінай супольнай яго прыкметай было адмоўнае стаўленне да існуючай эканамічнай і палітычнай рэальнасці. Найбольш уплывовая Камуністычная партыя Заходняй Беларусі фактычна была арганізацыяй, падпарадкаванай савецкаму кіраўніцтву. Апрача беларусаў у яе радах шмат было яўрэяў, рускіх і палякаў. На Беласточчыне арганізацыя налічвала пару соцень членаў, сярод якіх больш за 70 прац. складалі беларускія сяляне[27]. Парадаксальна, што арганізацыя, заяўляючая аб неабходнасці ліквідацыі прыватнай уласнасці зямлі, мела найбольш прыхільнікаў сярод сялян. Безумоўна, беларускія сяляне не імкнуліся да калгасаў і бацькоўскай спадчыны не хацелі пазбаўляцца, а праграму і ідэалогію партыі мала разумелі. Да камунізму прыцягвала іх рашучая апазіцыйнасць гэтага руху ў адносінах да польскай дзяржаўнасці. Пераважная большасць гэтых камуністаў хадзіла ў царкву, лечыла

дзеці ў шаптух, верыла ў злыя духі і чараўніцы. Прыналежнасць сялян да камуністычнага руху напамінала больш удзельніцтва ў структурах рэлігійнай секты, чым палітычнай арганізацыі. Абраднасць, таямнічасць і чаканне моманту, калі раптам усё адменіцца было характэрным для большасці тагачасных рэлігійных рухаў на Беласточчыне. Камунізм ствараў сялянам атракцыйны спосаб паводзін у адносінах да неакцэптаванага рэжыму, супакойваў перш за ўсё псіхалагічныя патрэбы гэтага асяроддзя.

Усходняя Беласточчына ў трыццатыя гады бачылася ўладамі як тэрыторыя цалкам захопленая камуністамі[28]. Сіла камуністаў выплывала тут з адсутнасці канкурэнтных нацыянальных беларускіх арганізацый. Спробы стварэння некамуністычных структур заўсёды выклікалі супрацьдзеянне з боку ўлад. Камуністычная арганізацыя дзейнічала нелегальна і не патрабавала дазволу ў дзяржаўнай адміністрацыі на існаванне. Фінансаваная яна была савецкім урадам і таму нават найбольшыя паліцыйныя рэпрэсіі не спынялі яе дзейнасці. Вельмі хутка замест ліквідаваных структур узнікалі новыя.

КПЗБ дзейнічала ва ўсіх гмінах усходняй Беласточчыны, аднак нельга сказаць, што кантралявала тут грамадскія настроі. Партыя не раз заклікала сялян не плаціць падаткаў, не адпрацоўваць шарварак і не падпарадкоўвацца распараджэнням дзяржаўных улад. Водгук на гэтыя заклікі быў аднак памяркоўны. Толькі ў Райску Бельскага павета ў 1934 г. дайшло да адкрытага выступлення супраць улад і бітвы вяскоўцаў з атрадам паліцыі.

Пра камуністаў сяляне ведалі толькі тое, што яны — прыхільнікі Расіі, якая псіхалагічна, рэлігійна і культурна была ім бліжэй за Польшчу. Савецкі Саюз успрымаўся імі як новая форма расійскай дзяржаўнасці. Пра тое, што адбывалася ў Расіі пад бальшавіцкім кіраваннем сяляне ведалі няшмат. Польскай прэсы не чыталі, а калі нават чыталі тады, весткі пра калектывізацыю ўспрымалі выключна як варожую, антысавецкую прапаганду. Да 1939 г. на Беласточчыне не ўзніклі ніякія прадпасылкі, якія б выклікалі адмоўнае стаўленне да камунізму. Эрозія камуністычнай міфалогіі пачалася разам з прыходам савецкай улады на Беласточчыну ў верасні 1939 г.

У 1926 г. палітычнае жыццё ва ўсходняй Беласточчыне і цэлай Заходняй Беларусі змяніла Беларуская сялянска-работніцкая грамада.

Партыю стварылі ў палове 1925 г. Браніслаў Тарашкевіч, Пятро Мятла, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Павел Валошын — дзеячы, якія на пачатку дваццатых гадоў глыбока верылі, што ва ўмовах польскай дэмакратыі беларусы дачакаюцца прынамсі культурнай аўтаноміі. Расчараваныя стаўленнем польскіх элітаў да беларускай праблемы выбралі арыентацыю на Савецкую Беларусь. У тым часе за ўсходняй мяжой Польшчы буйна развівалася беларускае нацыянальнае жыццё і нішто не паказвала, што праз некалькі гадоў бальшавікі знішчаць гэтую культуру разам з яе стваральнікамі.

Ад паловы 1926 г. Грамада развівалася проста маланкавымі тэмпамі. У канцы года налічвала больш за сто тысяч членаў, а яе арганізацыйныя структуры ўзнікалі ў кожнай гміне[29]. Дынамічнасць грамадоўскага руху выклікала перапалох не толькі сярод лакальнай адміністрацыі і паліцыі, але таксама цэнтральных улад і польскага грамадства. Партыя, не парушаючы законаў Польшчы, стварыла апазіцыйны рух, які ў сапраўднасці быў антыдзяржаўным. У палове студзеня 1927 г., парушаючы ўсе канстытуцыйныя нормы, улады Польшчы прывялі Грамаду ў стан ліквідацыі, а кіраўніцтва партыі паставілі перад Віленскім акруговым судом. На Беласточчыне грамадоўскі рух развіваўся перш за ўсё ў тых мясцовасцях, у якіх існавалі гурткі КПЗБ. Камуністы часта былі першымі арганізатарамі структур Грамады. Гэта партыя дазволіла ім легальна дзейнічаць і фактычна стала інструментам іх палітыкі. У рады Грамады ва ўсходняй Беласточчыне масава ўступалі яўрэі, шмат таксама было палякаў. Партыя прапагандысцка прадстаўляла сябе перш за ўсё як заступніцу сялянства. Таму для польскіх сялян, якія жылі падобнымі праблемамі як і беларусы, апазіцыйнасць Грамады ўспрымалася як пратэст супраць палітыкі ўлад.

Малады рух асабліва прыцягваў моладзь. Перанаселеная вёска не давала ёй ніякіх перспектываў. Грамада стварала ілюзію руху наперад, выклікала надзею на змены. Маладых людзей прыцягвалі таксама арганізаваныя партыяй розныя формы культурнага жыцця. Форма дзейнасці Грамады мела характар бунту, што для гэтага асяроддзя было атракцыйным спосабам стаўлення да існуючага парадку.

Іншыя беларускія арганізацыі, якіх актыўнасць асабліва праяўлялася на Віленшчыне ці Наваградчыне, напрыклад, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый, Беларускі сялянскі саюз, на Беласточчыне мелі нязначныя ўплывы.

Вялікае значэнне ў жыцці беларусаў Беласточчыны мелі працэсы, якія праходзілі ў рэлігійным жыцці грамадства. Пераважная большасць беларусаў была праваслаўнага веравызнання. Канфесія ў існуючых палітычных умовах рашуча ўплывала на свядомасць вернікаў і пачуццё іншасці ў адносінах да каталіцкай эліты ўлады. Праваслаўная царква, якая раней падтрымлівалася ўладамі Расійскай імперыі, у Польшчы стала ўспрымацца як рэлікт чужога панавання. На пачатку дваццатых гадоў мінулага стагоддзя Царква патраціла шмат храмаў, паколькі ўлады ІІ Рэчы Паспалітай лічылі, што пабудаваны яны былі дзеля русіфікацыі польскага насельніцтва. Каталіцкі касцёл патрабаваў вярнуць яму маёмасць, якая раней належала Уніяцкай царкве. Такім чынам у самім горадзе Беластоку Каталіцкі касцёл пераняў дзве царквы, а будаваны сабор быў узарваны дынамітам. У першыя гады існавання польскай дзяржаўнасці Праваслаўная царква патраціла каля паўтысячы храмаў, у тым ліку больш за сто ў Гродзенскай губерні, да якой належала Беласточчына[30].

Такая палітыка ў адносінах да праваслаўя праводзілася ў трыццатых гадах на Холмшчыне, Палессі і Валыні. На Беласточчыне, Віленшчыне і Гродзеншчыне ўлады вырашылі выкарыстаць Царкву ў якасці інструмента паланізацыйнай палітыкі. У Віленскай духоўнай семінарыі і на факультэце праваслаўнай тэалогіі Варшаўскага універсітэта маладых святароў вучылі прапагандаваць польскую патрыятычную думку сярод беларускага насельніцтва. У палове трыццатых гадоў на Беласточчыне ўзнік „рух праваслаўных палякаў”. У 1935 г. у Беластоку было створана Аб’яднанне праваслаўных палякаў імя Язэпа Пілсудскага. Членамі арганізацыі, апрача маладых святароў, сталі ў большасці рускія і тыя беларусы, месца працы якіх залежала ад дзяржаўных устаноў. Узнікненне Аб’яднання было інспіраванае камендатурай мясцовай паліцыі. Праграма дзейнасці, а нават парадак кожнага сходу раней узгадняўся з гэтай дзяржаўнай

установай[31]. Адразу пасля ўзнікнення арганізацыі яе дзеячы пачалі патрабаваць ад святароў пропаведзей і чытання *Святога Пісання* ў цэрквах на польскай мове. Дзяржаўныя святы на Беласточчыне сталі ў цэрквах адзначацца спяваннем патрыятычных песень. Аднак адмоўныя рэакцыі вернікаў, асабліва на вёсках, прымушалі святароў да памяркоўнасці. Выкананне патрабаванняў улад звычайна вяло да кампраметацыі духоўнікаў.

У 1938 г. структуры Аб'яднання праваслаўных палякаў узніклі ў Гродне, Ваўкавыску, Навагрудку і Вільні. На Беласточчыне пачалі стварацца прыхадскія гурткі. Неўзабаве цэнтрам гэтага руху стала Гродна — сядзіба маладога епіскапа Савы (Саветава), якога ўлады абавязалі стаць яго апекуном. Пачалася тады падрыхтоўка да ўвядзення літургіі на польскай мове, да якой пераклады літургічных тэкстаў рыхтаваліся некалькі гадоў раней. Вайна спыніла гэты працэс, а чарговыя рэжымы — савецкі, а пасля нямецкі — мелі зусім іншыя канцэпцыі арганізацыі рэлігійнага жыцця на гэтай тэрыторыі.

Сярод беларускага насельніцтва Беласточчыны вельмі паспяхова пашыраліся розныя рэлігійныя плыні, не звязаныя ні з Праваслаўнай, Пратэстанцкай ці Каталіцкай цэрквамі. Сектанцтва было прывезена найчасцей з Расіі пасля вяртання беларусаў з бежанства. Шматтысячную групу вернікаў амаль з усяе Беласточчыны прыцягнуў да сябе Ілья Клімовіч — селянін з вёскі Грыбоўшчына каля Крынак. Клімовіч пабудаваў царкву, аб'явіў сябе прарокам і загадаў сваім паклоннікам рыхтавацца да хуткага ўжо канца свету. У Грыбоўшчыну ішлі праваслаўныя не толькі з Сакольшчыны, але таксама з Беластоцкага, Бельскага і Гродзенскага паветаў. Клімовіч стаў вялікім маральным і рэлігійным аўтарытэтам. Паралельна, у адпаведнасці росту яго значэння, змяншалася роля мясцовых царкоўных структур. Дзяржаўныя ўлады і каталіцкая іерархія неафіцыйна падтрымлівалі гэты рух, таму што аслабляў ён канкурэнтнае для каталіцызму праваслаўе[32].

Спроба беларускіх дзеячаў прыцягнуць Царкву да нацыянальнага руху на Беласточчыне аказалася зусім безвыніковай. Падчас нямецкай акупацыі ў 1915-1918 гадах узніклі спрыяльныя ўмовы для развіцця культурнага і асветнага жыцця ўсіх народаў, якія насялялі гэтую тэрыторыю. Праваслаўных беларусаў тут аднак амаль

зусім не было. Пераважная большасць, згодна з жаданнем царскіх улад, выехала ў глыб Расіі. Беларускамоўныя каталікі Беластоцкага і Сакольскага паветаў знаходзіліся пад ідэйным уплывам сваіх святароў, якія выказваліся за іх польскую нацыянальную арыентацыю. Толькі там, дзе ксяндзы адчувалі сябе беларусамі, рабіліся спробы ўвядзення беларускай мовы ў казанні і арганізацыю асветнай сістэмы на роднай мове. Выпадкаў ажыццяўлення такіх ініцыятыў было няшмат. Ксяндзы пераважна выхоўвалі сваіх беларускамоўных вернікаў на патрыётаў Польшчы.

Значна раней існавала народная перакананасць, што каталіцызм — гэта „польская вера”, а праваслаўе — „руская вера”. У міжваенны перыяд узніклі знакамітыя ўмовы для замацавання такога перакананння сярод беларусаў, а ў выніку вельмі хуткай асіміляцыі каталікаў. Школа, касцёл і ўсе дзяржаўныя ўстановы згодна спрыялі фарміраванню міфу, што католік — гэта паляк. Таму на Беласточчыне да 1939 г. большасць беларускамоўных каталікаў нават не сумнявалася ў тым, што яны з’яўляюцца часткай польскай нацыянальнасці. Працэс фарміравання нацыянальнай свядомасці праваслаўных праходзіў больш складана. Царква і руская культура, дамінуючая ў яе жыцці, спрыялі замацаванню перакананняў пра „рускую веру”. Дзяржаўныя ўлады ў сваю чаргу імкнуліся надаць польскай культуры і мове такую ж функцыю ў жыцці Царквы, якую раней мелі руская культура і мова. Паланізацыі праваслаўных беларусаў, таксама як і каталікаў, спрыяла школа, служба ў арміі, кантакт з дзяржаўнымі ўстановамі і прапаганда.

На Беласточчыне, у адрозненні ад Віленшчыны, яшчэ не нарадзіўся рух, які патрабаваў бы ад царкоўных улад ці святароў прымянення беларускай мовы ў рэлігійным жыцці. Калі польская мова ў царкве выклікала абурэнне і падазрэнне ў падрыхтоўцы да каталізацыі, руская бачылася натуральным элементам рэлігійнага жыцця. Свая мова — „простая” — у перакананні сялян была мовай вёскі, ніхто на ёй не вучыў ні пісаць, ні чытаць, таму і не адчувалася імі патрэбы змагання за яе прысутнасць у царкве ці школе. Мясцовыя дзеячы звязаны былі з арганізацыямі, якія праслаўлялі Савецкі Саюз, новую Расію і не надта бачылі яны патрэбу намаганняў на тое, каб

беларуская мова заняла месца рускай, тым больш што большасць з іх чытаць і пісаць умела толькі па-руску.

Асаблівасцю Беласточчыны былі выпадкі дэкларавання атэізму ў сялянскім асяроддзі[33]. Большасць гэтых атэістаў свой новы светапогляд сфарміравала падчас пабыўкі ў Расіі ў 1917-1919 гадах. Пад уплывам бальшавіцкай прапаганды аўтарытэт Царквы моцна пацярпеў, а фізічная ліквідацыя святароў і разбуранне храмаў прывялі ў хуткім часе да маргіналізацыі адной з апораў маральнага і палітычнага парадку ў Расійскай імперыі. Сяляне Беласточчыны былі сведкамі гэтых падзей, некаторыя прымалі ў іх непасрэдны ўдзел. Атэізацыі ў міжваенны перыяд спрыяла таксама членства ў радах КПЗБ. Аднак камуністы ніколі не выступалі супраць святароў, калі былі яны аб’ектам атакі з боку ўлад. Наадварот, арганізавалі розныя формы пратэсту, калі ў царкве праводзілася дзяржаўная прапаганда. Былі гэта выпадкі вельмі рэдкія, таму што большасць святароў па сваёй волі не рабіла нічога, чаго чакалі ўлады.

У свядомасці большай часткі вясковага насельніцтва веравызнанне і тэрмін „праваслаўны” былі нечым універсальным, заступалі нацыянальнасць, вызначалі кола культурнай прыналежнасці і месца ў грамадскай іерархіі, абазначалі акрэслены светапогляд і стаўленне да існуючага палітычнага парадку. „Праваслаўным” называў сябе не толькі чалавек, які хадзіў у царкву і верыў у Бога, быў ім таксама камуніст, які адкрыта заяўляў пра свой атэістычны светапогляд і сектант, які нарадзіўся і выхаваўся ў праваслаўнай сям’і. Перш за ўсё быў гэта чалавек, які меў пачуццё іншасці ў адносінах да каталікаў. Пачуццё прыналежнасці да праваслаўнай супольнасці дамінавала над нацыянальнымі і палітычнымі падзеламі. Камуніст, беларус, праваслаўны паляк і рускі — усе яны былі „сваімі”, таму што адчувалі падобны маральны парадак і выраслі на базе адной традыцыі і абраднасці. Іх рэакцыі найчасцей не былі залежныя ад дэклараванай нацыянальнасці ці палітычнай арыентацыі.

Беларуская нацыянальная ідэалогія прысутнічала на Беласточчыне з пачатку XX стагоддзя. Віленская „Наша Ніва” мела тут шмат карэспандэнтаў і падпісчыкаў. Найбольш шкодным для беларускага руху на гэтай тэрыторыі быў перыяд бежанства. Некалькі гадоў адсутнасці на сваёй зямлі ў той час, калі наступаў

уздым нацыянальных настрояў, замест росту пачуцця этнічнай супольнасці далі разгубленасць і адкрытасць на знешнія культурныя і палітычныя ўплывы. Вынікам такой разгубленасці былі пазнейшыя пошукі самавызначэння. Свае праўды прапаведавалі Царква, дзяржава, камуністы, сектанты і беларускія дзеячы. Селянін найбольш ахвотна карыстаўся сваёй філасофіяй і быў „тутэйшым", „простым чалавекам"[34]. Пачуццё беларускай нацыянальнай свядомасці ішло разам з палітычнымі, культурнымі і асветнымі арганізацыямі. Тыя аднак пераважна былі прасавецкай і пракамуністычнай арыентацыі. Таму беларускасць да 1939 г. на Беласточчыне мела выразна палітычна акрэслены характар.

***Яўген Міранові***


[1] J. Tomaszewski, Robotnicy Białorusini w latach 1919-1939 w Polsce, „Acta Baltico-Slavica", 1967, s. 94-95.
[2] Ibidem, s. 105; B. Zaborski, Liczba i rozmieszczenie mieszkańców Polski według języków i wyznań, „Sprawy Narodowościowe", 1937, nr 1-2, s. 79.
[3] J. Zaleski, Międzynarodowa ochrona mniejszości, Warszawa 1932, s. 123-125.
[4] Ідэя гэтая з'явілася ў пачатку XX стагоддзя ў выглядзе твора Рамана Дмоўскага Myśli nowoczesnego Polaka. Яго першае кніжнае выданне з'явілася ў 1903 г. У Львове, а пасля былі яшчэ 11 выданняў у суверэннай ужо Польшчы. Кніжка ў міжваенны перыяд стала быццам бы бібліяй польскага нацыянальнага руху.
[5] L. Wasilewski, Sprawa kresów i mniejszości narodowych, Warszawa 1925, s.17; K. Srokowski, Sprawa narodowościowa na Kresach Wschodnich, Kraków 1924, s. 4-5; A. Kryński, Struktura narodowościowa miast polskich, „Sprawy Narodowościowe", 1937, nr 6, s. 76-77; J. Tomaszewski, Robotnicy Białorusini..., s. 94-106.
[6] B. Zaborski, Liczba i rozmieszczenie..., s. 76-77.
[7] J. Kaja, Klasa robotnicza Białostocczyzny 1929-1939, Warszawa 1974, s. 44.
[8] J. Tomaszewski, Ojczyzna nie tylko Polaków, Warszawa 1985, s. 79.
[9] A. A. Сорокин, Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939), Минск 1968, с. 27-28
[10]J. Tomaszewski, Z dziejów Polesia. Zarys stosunków społeczno-ekonomicznych, Warszawa 1963, s. 56.
[11] У. Юзвюк, Гайнаўскі павет беластоцкага ваяводзтва, „Беларускі каляндар", Беласток 1961, с. 113
[12] Вобраз штодзённага жыцця жыхароў беларускай вёскі на Беласточчыне вельмі яскрава апісаў Васіль Петручук у кніжцы "Пожня", Беласток 1987
[13] Z. Landau, J. Tomaszewski, Gospodarka Polski międzywojennej, t. I, Warszawa 1967, s. 170.
[14] Такую дэградацыю беларускай інтэлігенцы ў міжваенны перыяд паказаў польскі пісменнік Марыян Брандыс у апавяданні Królestwo Białorusi, [w:] Strażnik królewskiego grobu, Warszawa 1984.
[15] К. Сідаровіч, Па жыццёвых сцежках, [у:] Лёс аднаго пакалення, Беласток 1996, с. 5-13.

[16] W. Choruży, Ks. dr Józef (Atanazy) Reszeć (1890-1958), „Białoruskie Zeszyty Historyczne", Białystok 1997, z. 7, s. 161.
[17] К. Сідаровіч, Па жыццёвых сцежках, с. 11-12.
[18] W. Roszkowski, Gospodarcza rola większej własności ziemskiej w Polsce 1918-1939, Warszawa 1986, s. 57.
[19] Posłowie rewolucyjni w Sejmie 1920-1935, Warszawa 1961, tekst przemówienia Bronisława Taraszkiewicza, s. 114.
[20] A. Łuckiewicz, Okupacja polska na Białorusi, Wilno 1920.
[21] Браты Беларусы Партызаны, „Беларускі партызан", 1922, н-р 1.
[22] Працэс 45-ці Беларусаў у Беластоку, Вільня 1923, с. 16.
[23] Ibidem, s. 28-31.
[24] Dziennik Ustaw RP, 1924, nr 77, poz. 765.
[25] Dziennik Ustaw RP, 1925, nr 3, poz. 33.
[26] M. Siemakowicz, Założenia programowe głównych obozów politycznych wobec szkolnictwa dla ludności białoruskiej w II Rzeczypospolitej, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", Białystok 1998, z. 9; M. Rogalska, Białorusini w oczach piłsudczyków, „Kontrasty", 1985, nr 6.
[27] M. Nosowicz, Struktura i skład społeczno-zawodowy KPZB na Białostocczyźnie, „Z pola walki", 1973, nr 4, s. 207.
[28] Archiwum Państwowe w Białymstoku (akta Archiwum Komitetu Wojewódzkiego PZPR w Białymstoku), sygn. 109/IVC/14, poz. 12.
[29] A. Bergman, Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu, Warszawa 1977, s. 91, 112.
[30] K. Srokowski, Sprawa narodowościowa na Kresach Wschodnich, Kraków 1924, s. 53.
[31] Wojewódzkie Archiwum Państwowe w Białymstoku (akta Komendy Miasta i Policji Państwowej w Białymstoku), sygn. 6, k. 7-8.
[32] Шырэй пра дзейнасць грыбоўскай секты пішуць Аляксей Карпюк (Raj w Wierszalinie, czyli przypadki Eliasza, Białystok 1993) і Ўладзімір Паўлючук (Wierszalin. Reportaż o końcu świata, Kraków 1974).
[33] W. Pawluczuk, Procesy dezintegracyjne w prawosławnych społecznościach wiejskich, „Wieś Współczesna", 1967, nr 3.
[34]W. Krzysztofik, Jasionówka wieś powiatu sokólskiego, Poznań 1934, s. 194-195.